


УРАЖАННІ ПАСЛЯ СХОДУ 2-5

ПРЫПРАВЫ ЗАМЕСТ ЛЕКАЎ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 КРАСАВІКА 2024 г. СУБОТА № 84 (30218)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ПЯРЦОЎ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«На ліквідацыю наступстваў усяго комплексу Чарнобыльскай аварыі ўжо патрачана, паводле даволі сціплых падлікаў, больш як $19 млрд. І тут у комплексе, напэўна, варта разглядаць і рэабілітацыю зямель — зямель паўднёвых, урадлівых, Гомельскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей; і сацыяльную дапамогу людзям, якія пацярпелі ад гэтай аварыі, медыцынскую рэабілітацыю, лячэнне, аздараўленне і выплаты; дапамогу людзям, якія сёння жывуць на гэтых тэрыторыях... Гэта не проста памяць аб той даце. Гэта рэальна каласальная работа, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве, якой удзяляе ўвагу кіраўнік дзяржавы».*

## КОРАТКА

- **Апублікаваны зацверджаныя УНС Канцэпцыя нацбяспекі і Ваенная дактрына.**
- У Беларусі з 25 красавіка пачаліся выплаты матэрыяльнай падтрымкі ветэранам, былым вязням фашызму, членам сем'яў загінулых у гады вайны ваеннаслужачых.
- **Прысвечаны Дню Перамогі адзіны ўрок пройдзе ва ўсіх школах Беларусі 7—8 мая.**
- Пераліκі відаў дзейнасці ІП апублікуюць для абмеркавання 15 мая.
- **Сезон атракцыёнаў і фантанаў адкрыўся ў Мінску.**

ISSN 1990 — 763X

# З пазыўным «Лідар»



Фота БелТА.

**Яўген Старадуб з пазыўным «Лідар» працуе на пасадзе начальніка дзяжурнай змены пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада ў Магілёве. Ён актыўны ўдзельнік конкурсаў, якія штогод ладзяцца ў МНС.**

**Найбольш дзейснымі для яго сталі спаборніцтвы на найлепшага ратавальніка-вышынніка. У мінулым годзе ў барацьбе за лідарства заняў трэцяе месца, а ў гэтым сярод 36 удзельнікаў здолеў заваяваць першае.**

На слыху

## ЯКОЕ ЯНО, ШКОЛЬНАЕ МЕНЮ?



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Падчас абеду ў сталовай гімназіі № 13 г. Мінска.

**Ежа для дзяцей павінна быць смачнай ці карыснай? Сёння, калі вывелі агульную формулу школьнага грамадскага харчавання, так адназначна пытанне ўжо не ставіцца — харчаванне школьнікаў павінна быць і смачным, і карысным, і збалансаваным.**

Летась у Беларусі стартаваў пілотны праект па арганізацыі школьнага харчавання. Нядаўна на нарадзе пад старшынствам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Рамана Галоўчанкі падводзілі папярэднія вынікі рэалізацыі гэтага праекта.

СТАР. 7

Прыклад для пераймання

## ШТО ЗА ТАЕМНЫМІ ДЗВЯРЫМА?

### Як вясковы тэатр, створаны бацюшкам, дапамагае знайсці шлях да Бога

**У храм у гонар святога Дзімітрыя Салунскага прыхода Раства Прасвятой Багародзіцы, што ў вёсцы Старое Сяло, я прыехала загадзя: там якраз ішла служба. Прыемна было ўбачыць на ёй шмат дзяцей: ад немаўлят, якіх маладыя мамы трымалі на руках, да падлеткаў. Маю ўвагу адразу ж прыцягнула дзяўчынка ў яркай вязанай шапачцы, якая падавала прыхаджанам цеплату (запіўку) пасля прычасця. Як высветлілася, гэта дачка святара Агнія. Яна, дарэчы, яшчэ спявае на клірасе, а ў велікодным спектаклі, на рэпетыцыю якога я і прыехала, будзе іграць ролю Бурацiны.**

СТАР. 8



Тата Карла блаславе Бурацiну ў школу.